*М. А. Бабчанок*

## ДА ПЫТАННЯ КЛАСІФІКАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ АКАЗІЯНАЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ

Вывучэнне і захаванне беларускай народнай абраднасці як неад'емнай часткі духоўнай культуры – важная задача беларускай фалькларыстыкі. Абрады і традыцыі замацоўваюць дасягненні асабістага і грамадскага вопыту, з'яўляюцца моцным сродкам стабілізацыі, перадачы новым пакаленням і адлюстравання ў жыцці міжасобасных і грамадскіх адносін. Устойлівасць абрадаў забяспечвае захаванне для будучых пакаленняў дасягненняў духоўнай культуры, лепшых узораў працы, эталонаў дзеянняў, пачуццяў.

Аказіянальнымі (лац. occasionalis – выпадковы) называюць абрады, што ўзнаўляюцца ў быце не рэгулярна, як каляндарныя ці сямейныя, а па меры неабходнасці ці ўзнікнення асобных, часцей крытычных, крызісных абставін. Такія абрады характарызуюцца рухомасцю, своеасаблівым характарам працякання абрадавага часу, што абумоўліваецца жыццёвымі абставінамі, якія выклікаюць правядзенне абрадаў. Залежнасць аказіянальнай абраднасці ад тых сітуацый, якія часцей узнікаюць без жадання чалавека або па неабходнасці, вызначае спецыфіку і накіраванасць яе правядзення. Абрадавым дзеянням і вербальным тэкстам уласцівы кансерватызм і архаічнасць, звязаныя з узнікненнем вострай неабходнасці змянення сітуацый, што выклікалі парушэнне звыклага жыцця чалавека.

Аказіянальныя абрады праводзяцца па неабходнасці або выпадковасці, якая ўжо адбылася, гэта значыць «постфактум» – пасля факта здарэння сітуацыі, і маюць за мэту спробу ўздзеяння на яе. Менавіта гэты від абраднасці можна ўмоўна падзяліць паводле тых абставін, якія выклікалі неабходнасць правядзення пэўнага аказіянальнага абрада.

*Аказіянальныя абрады, неабходнасць правядзення якіх выклікана катаклізмамі надвор'я.* Напрыклад: мароз (звычаі заклінання марозу, заснаваныя на лічэнні лысых [1, с. 60]); град (накіраваны на суцішэнне або прадухіленне граду [1, с. 62, 77]); бура, навальніца (праводзяцца з мэтай абароны хаты ад удараў Перуна, супраць «раз'юшанай буры», «каб разагнаць навальнічныя хмары» [1, с. 74–75, 79]); дождж, паводка (праводзяцца з мэтай спыніць дождж і адагнаць хмары [1, с. 76, 78, 81]); засуха (звычаі выклікання дажджу [1, с. 87–96]); маланка, якая магла выклікаць пажар (звязаны з захаваннем грамавых стрэлаў дзеля абароны ад удараў маланкі [1, с. 67, 496]); голад (абрады і звычаі, накіраваныя на забеспячэнне ўрадлівасці).

*Аказіянальныя абрады, якія праводзіліся з нагоды сітуацый, звязаных са здароўем чалавека.* Сітуацыі: хваробы, эпідэміі, моры (абрады, замовы, спецыяльныя рытуальныя дзеянні, якія праводзіліся падчас захворванняў, распаўсюджвання эпідэміі).

*Аказіянальныя абрады, правядзенне якіх абумоўлена бытавымі сітуацыямі.* Напрыклад: капанне калодзежа (звычаі і абрады, звязаныя з культам вады); будаўніцтва хаты (абрады, накіраваныя на забеспячэнне добрага і шчаслівага жыцця людзей у новай хаце і жывёлы ў хлявах; вераванні, звязаныя з выбарам месца для будаўніцтва, матэрыялаў на лабудову хаты, правядзенне абрадавых дзеянняў падчас закладзін, улазін, або ўводзін і інш.); пажар (абрады, накіраваныя супраць узнікнення пажару або каб спыніць яго распаўсюджванне, «каб задобрыць агонь» [1, с. 500]).

З'яўленне аказіянальных абрадаў – своеасаблівая рэакцыя на тыя жыццёвыя абставіны, якія чалавек быў непадуладны змяніць без прыцягнення спецыяльных спосабаў, што мелі магічны сэнс; меркаванне пра магчымасці абрадавых дзеянняў як сродкаў прамога ўздзеяння чалавека на прыроду.

Аказіянальная абраднасць адметная і разнастайнасцю выкарыстання сродкаў магчымага ўздзеяння на сітуацыю. Акрамя вербальнай часткі абраду, з гэтай мэтай шырока выкарыстоўваліся розныя матэрыяльныя рэчы (свечы, рушнік, лапата, посуд і інш.), рытуальная ежа і расліны (мак, боб, гарох, капуста і інш.), вада, агонь, зёлкі, нават жывёлы і птушкі (жаба, вуж, крот, вусень і інш.), якія выконвалі ў абрадзе сімвалічную аберагальную і ачышчальную ролі.

Аказіянальныя абрады цесна звязаны з аграрна-каляндарнымі і сямейна-бытавымі звычаямі, яны даволі часта пераплятаюцца, узаемапранікаюць і дапаўняюць адзін аднаго. Некаторыя з іх трансфармаваліся ў замовы, дзіцячыя песні, гульні і іншыя жанры. Так, звычаі выклікання дажджу сталі выкарыстоўвацца дзецьмі як заклічкі. Дзеці спяваюць, калі ім дождж надакучыць:

*Дожджык, дожджык,*
*Пірыстань, пірыстань!*
*Я паеду ў Дзірыстань*
*Богу маліцца,*
*Хрысту пакланіцца.*
*А ў Бога сірата*
*Адчыняла варата*
*Шалковым платочкым,*
*Новінькім замочкым.*

А ў наступнай прыпеўцы дзеці жадаюць, наадварот, усілення дажджу:

*Даждзёк, даждзёк, прыпусты:*
*Мы схуваемся ў кусты [1, с. 434].*

***Літаратура***

1. Гульні, забавы, ігрышчы / склад. А. Ю. Лозка. 2-е выд. Мінск, 1996.
2. Зямля стаіць пасярод свету... Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. Мінск, 1996.
3. *Чистов К. В.* К классификации обрядов жизненного цикла // Язычество восточных славян. Л., 1990.